мови : етимологічний та етнолінгвістичний аспекти : [монографія] / Л. В. Савченко. – Сімферополь : Доля, 2013. – 600 с.

5. Станкевіч А. А. Раслінны код вясельнай абраднасці : назвы вясельнага дрэўца ў гаворках Веткаўскага і Добрушскага раёнаў Гомельшчыны / А. А. Станкевіч // Славянская фразеология в синхронии и диахронии : сб. науч. статей. – Вып. 1 / редкол. В. И. Коваль (отв. ред.) [и др.]. – Гомель : ГГУ им. Ф. Скорины, 2011. – С. 148–150.

6. Телия В. Н. Первоочередные задачи и методологические проблемы исследования фразеологического состава языка в контексте культуры // Фразеология в контексте культуры / отв. ред. В. Н. Телия. – М. : Языки рус. культуры, 1999. – С. 13–24.

7. Толстая С. М. Слово в контексте культуры / С. М. Толстая // Пространство слова. Лексическая семантика в общеславянской перспективе. – М. : Индрик, 2008. – 527 с.

**Список використаних джерел**

1. Вирган І. О. Російсько-український словник сталих виразів / І. О. Вирган, М. М. Пилинська ; за ред. М. Ф. Наконечного. – Х. : Прапор, 2009. – 864 с.

2. ФСУМ – Фразеологічний словник української мови / за ред. В. М. Білоноженко : у 2-х т. – К. : Наукова думка, 1993. – 984 с.

3. СФУМ – Словник фразеологізмів української мови / за ред. В. М. Білоноженко. – К. : Наукова думка, 2003. – 1104 с.

Стаття надійшла до редакції 21.11.2013 р.

УДК 811.161.3:398.92

**З. У. Шведава**

# ХАРАКТАРЫСТЫКА МЭТЫ І ЯКАСЦІ МАЎЛЕННЯ Ў БЕЛАРУСКАЙ ФРАЗЕАЛОГІІ

Шведова З. В. Характеристика мети і якості мовлення в білоруській фразеології.

У статті проведений семантичний аналіз виявлених одиниць фразеологізмів білоруської літературної мови, що складають два фразеосемантичних мікрополя – «цільова спрямованість мовлення» й «оцінка якості мовлення», у результаті чого встановлено 11 груп фразеологізмів з різними цільовими установками і виокремлено 6 груп за критеріями оцінки якості мовлення. Визначено культурно-національну інформацію, що акцентує увагу на негативному досвіді мовного спілкування білорусів.

*Ключові слова:* одиниця фразеологізму, мовлення, цільова установка, оцінка якості мовлення, критерій оцінки.

Шведова З. В. Характеристика цели и качества речи в белорусской фразеологии.

В статье проведен семантический анализ выявленных фразеологических единиц белорусского литературного языка, что составляют два фразеосемантических микрополя – «целевая направленность речи» и «оценка качества речи», в результате которого установлены 11 групп фразеологических единиц с различными целевыми установками и определены 6 групп по выделенным критериям оценки качества речи. Определена культурно-национальная информация, акцентирующая внимание на отрицательном опыте речевого общения белорусов.

*Ключевые слова:* фразеологическая единица, речь, целевая установка, оценка качества речи, критерий оценки.



© З. У. Шведава, 2013.

Shvedova Z. V. Characteristics of purpose and quality of speech in Belarusian phraseology.

The article presents semantic analysis of the sample group of phraseological units of the Belarusian language that constitute two phrase-semantic microfields –«purpose of speech» and «evaluation of the quality of speech». The study made it possible to identify 11 groups of phraseological units within the former and 6 groups within the latter microfield, basing on the previously determined criteria for evaluation of the quality of speech. The study highlights the national and cultural specific information that stresses the negative experience of communication among the Belarusians.

*Key words:* phraseological unit, speech, purpose, evaluation of the quality of speech, criteria for evaluation.

Фразеалогія кожнай мовы з’яўляецца своеасаблівай крыніцай пазнання і інтэрпрэтацыі культуры свайго народа. Не складае выключэння ў гэтых адносінах і беларуская фразеалогія, у якой «замацоўваюцца і фразеалагізуюцца менавіта тыя вобразныя выразы, якія асацыіруюцца з культурна-нацыянальнымі эталонамі, стэрэатыпамі, міфалагемамі і г.д. і якія пры ўжыванні ў маўленні ўзнаўляюць характэрны для той або іншай лінгвакультурнай супольнасці менталітэт» [4, с. 233]. Менавіта ў фразеалагічных адзінках (далей ФА) фіксуюцца і перадаюцца ад пакалення да пакалення агульначалавечыя і нацыянальныя ўяўленні пра дабро і зло, пра станоўчае і адмоўнае ў характары, паводзінах чалавека, яго дзейнасці і інш. Адно з цэнтральных месцаў у фразеалогіі беларускай літаратурнай мовы займае група ФА, што аб’яднаны агульным значэннем і складаюць фразеасемантычнае поле «маўленчая дзейнасць», якое ў сваю чаргу распадаецца на шэраг мікрапалёў, якія раскрываюць важнейшыя прыметы і ўласцівасці маўленчай дзейнасці чалавека, яе эмацыйную афарбоўку, мэту і задачы, таго, хто гаворыць, даюць характарыстыку і ацэнку і інш. Выяўляецца, што для беларускай лінгвасупольнасці важна, што чалавек гаворыць, ці змест маўлення, як гаворыць, калі і ў якіх умовах, ці месца маўленчай дзейнасці.

У межах артыкула аб’ектам даследавання абраны два найбольш важныя мікрапалі фразеасемантычнага поля «маўленчая дзейнасць»: (I) «мэтавая накіраванасць маўлення» і (II) «ацэнка якасці маўлення», рэпрэзентаваныя ФА, што выяўлены метадам суцэльнай выбаркі з фразеалагічнага слоўніка беларускай літаратурнай мовы [3].

Мэтай артыкула з’яўляецца семантычная групоўка ФА вызначаных двух мікрапалёў, на аснове чаго канкрэтызуецца пэўная задача, мэта маўлення чалавека і вызначаецца ацэнка якасці яго маўлення, выяўляецца дадатковая нацыянальна-культурная інфармацыя пра нормы і правілы ці антыправілы маўленчых паводзін беларуса

© З. У. Шведава, 2013.

праз ацэнку і характарыстыку абраных вобразаў.

І. Намі выдзелена 80 ФА, што складаюць толькі фразеасемантычнае мікраполе «мэтавая накіраванасць маўлення» і якія ў сваю чаргу падзяляюцца на 11 груп у залежнасці ад агульнай семы як своеасаблівай мэты маўлення. У аснове парадку падачы выдзеленых груп ляжыць колькасны паказчык ФА – ад большага да меншага пры мінімуме 2 ФА.

ФА з агульнымі семамі «асуджэнне» і «крытыка» (агульная колькасць 21 ФА). Некалькі ФА з семай «асуджэнне» нясуць адмоўную канатацыю: *апалосквацъ (паласкаць) косці (костачкі)* «асуджаць чые-н. недахопы»; *перамываць (мыць) костачкі (косці, косткі)* «асуджаць чые-н. недахопы, крытыкаваць каго-н.»; *перабіраць (разбіраць) па костачках* «асуджаць чые-н. недахопы, абмяркоўваць каго-н.»; *паказваць пальцам* «адкрыта, публічна асуджаць, ганіць каго-, што-н.»; *тыкаць (тыцкаць) пальцам* «адкрыта, публічна асуджаць, ганіць каго-, што-н.»; *браць на язык* «рабіць каго-н. аб’ектам размоў, насмешкі; асуджаць чые-н. недахопы»), кампаненты якіх (*косці, палец, язык, мазгі*) выяўляюць матывацыю дзеяння адносна ўказання каго асуджаюць і з дапамогай чаго.

Больш паловы ад усёй колькасці ФА дадзенай групы маюць семы «крытыка», «приборка» (*браць пад абстрэл* «рэзка крытыкаваць»; *браць у пераплёт / узяць у пераплёт* «лаяцца, крытыкаваць за што-н.»; *браць у абарот* «лаяцца, прабіраць за што-н.»; *браць у работу / узяць у работу, браць у шоры / узяць у шоры* «прабіраць, крытыкаваць за што-н.»; *здымаць стружку* «моцна прабіраць каго-н.»; *мыліць шыю / карак* «моцна прабіраць каго-н., строга выгаворваць»; *павышаць голас, падымаць (узнімаць) голас* «гаворачы з раздражненнем, гучней, чым звычайна, прабіраць каго-н.»; *прамыўка мазгоў* «строгая вымова, праборка, наганяй»; *разбор палётаў* «крытыка каго-н., праборка, суровая вымова за што-н.»; *спускаць (зняць) скуру (шкуру, сем шкур)* «рэзка прабраць, пакараць каго-н.»), а іх метафарызаваныя вобразы выяўляюць ацэнку маўленчай асобы паводле негатыўнага дзеяння таго, хто паслужыў прычынай вымовы, крытыкі.

І астатнія ў асноўным аднаструктурныя ФА, акрамя семы «прабіраць», утрымліваюць сему «сварыцца» (*даваць гарту, даваць дыхту, даваць перцу, даваць чосу, даваць прыкурыць, даваць чапаласу, задаваць пары, прадзіраць з пясочкам* «моцна сварыцца на каго-н., рэзка прабіраць каго-н.»), але іх назначэнне – выяўляць высокую ступень інтэнсіўнасці «праборкі» і даваць негатыўную


© З. У. Шведава, 2013.

ацэнку папярэдняму дзеянню.

ФА з агульнымі семамі «папрок», «дакор» (усяго 9 ФА). У ФА *калоць вочы, калоць у вочы (у вока)* «моцна папікаць, папракаць, дакараць каго-н.»; *тыцкаць у вочы, тыцкаць у нос* «непачціва папікаць, папракаць каго-н., назойліва напамінаючы аб чым-н.»; *выядаць вочы* «вельмі здзекліва дакараць каго-н.»; *мыліць галаву* «моцна прабіраць каго-н., выгаворваць з дакорам» саматычныя кампаненты называюць найбольш «адчувальныя» органы, а дзеяслоўныя найбольш балючыя «фізічныя» ўздзеянні на іх. Да іх далучаюцца ФА *падпусканне шпілек* «падколванне каго-н., гаварэнне чаго-н. з'едлівага, непрыемнага»; *падпускаць шпільку* «гаварыць што-н. непрыемнае, з'едлівае; падколваць каго-н.»; *падпускаць шпільку пад пазногці* «дапякаць, прычыняць душэўны боль з'едлівымі намёкамі ў размове» з празрыстай матывацыяй і новымі вобразамі, якія даводзяць мэту ўздзеяння маўленнем па аналогіі з фізічнымі дзеяннямі.

ФА з агульнымі семамі «абгавор», «пляткарства» (9 ФА): *мыць языком* «абгаворваць, бэсціць»; *мянціць языком, часаць язык* «распаўсюджваць плёткі, абгаворваць каго-н.»; *падхопліваць на языкі* «даведаўшыся пра што-н., паспешліва распаўсюджваць пачутае, абгаворваць каго-, што-н.»; *пачасаць языком* «папляткарыць, абгаварыць каго-н.»; *апалосквацъ (паласкаць) косці (костачкі), папаласкаць косці, перамываць (мыць) костачкі (косці, косткі)* «пляткарыць, абгаворваць каго-н.», *перабіраць <усе> костачкі (косці)* «абгаворваць каго-н., распаўсюджваць плёткі». Тут праз дзеянні з языком як органам маўлення, касцьмі як вобразным прадстаўленнем чалавека канцэптуалізуюцца паняцці «абгавор», «пляткарства», якія разумеюцца як нядобразычлівыя выказванні пра каго-небудзь, а яшчэ вызначаецца і дыферэнцыруецца мэта маўлення.

ФА з агульнымі семамі «падман», «ошуканства» (8 ФА): *вешаць лапшу <на вушы>* «падманваць каго-н., гаворачы няпраўду»; *заліваць кулі, заліваць пушку* «бессаромна лгаць, расказваць няпраўдападобнае»; *запудрыць мазгі, кампасціраваць мазгі, пудрыць мазгі* «знарок гаварыць што-н. няправільнае, падманваючы каго-н.»; *наплесці кашалёў* «нагаварыць абы-чаго, нахлусіць, напляткарыць»; *разводзіць турусы <на калёсах>* «балбатаць, гаварыць глупства, хлусіць», у якіх выяўляюцца вобразы хлусні, аб'яднаныя агульнай ідэяй «маніпуляванага ўздзеяння на суб'ект», якая характарызуецца самымі рознымі зменамі суб'екта, часам дзіўнымі, нерэальнымі, як у ФА *запудрыць/пудрыць мазгі* і *кампасціраваць мазгі*.

ФА з агульнай семай «видумка» (6 ФА): *з ветру вяроўкі віць,*

© З. У. Шведава, 2013.

*высмоктваць з пальца* «гаварыць, сцвярджаць што-н. без належных падстаў; выдумваць»; *гарадзіць плот* «выкручваючыся ў размове, гаварыць глупства, выдумляць што-н.»; *плесці кашалі, плесці кашалі з лапцямі, плесці лапці* «гаварыць абы-што, выдумваць». Як відаць, праз нерэальныя вобразы першых дзвюх ФА і пераноснае ўжыванне словазлучэнняў з кампанентамі *гарадзіць* і *плесці* абазначваецца маўленчая дзейнасць чалавека з мэтай выдумаць, гаварыць абы-што і такім чынам выяўляецца адмоўная ацэнка такога дзеяння.

ФА з агульнымі семамі «нагавор», «абвінавачанне», «абраза», «ганьба» (4 ФА): *вешаць сабак* «нагаворваць на каго-н., лаяць, абвінавачваючы ў чым-н.»; *мяшаць з граззю* «ўсяляк прыніжаць, груба лаяць, несправядліва абвінавачваць»; *падтоптваць пад ногі* «чарніць, няславіць»; *мяшаць з зямлёй* «усяляк прыніжаць, ганьбіць, груба лаянь». Іх вобразы ілюструюць абазначванне маўленчай дзейнасці ў яго мэтавай устаноўцы зняславіць, абразіць праз вядомыя негатыўныя протасітуацыі (мяшаць з граззю, падтоптваць пад ногі і інш.) і такім чынам найперш выражаюць адмоўную ацэнку такой мэце маўленчай дзейнасці.

ФА з агульнай семай «просьба» (4 ФА): *біць чалом* «пачціва прасіць каго-н.»; *кланяцца ў ногі, падаць на калені* «ўніжана прасіць аб чым-н.»; *цалаваць рукі і ногі* «вельмі прасіць, маліць каго-н. аб чым-н.», якія, рэпрэзентуючы просьбу як мэту маўлення, сваімі вобразамі, абранымі кампанентамі па-рознаму характарызуюць (пачціва, уніжана, моцна), даюць розную ацэнку – станоўчую (кампанент *чало*) і адмоўную (кампаненты *ногі, калені*) як супастаўленне верху і нізу і выражаюць розную інтэнсіўнасць праяўлення просьбы.

ФА з агульнымі семамі «заклік» і «ўвага» (3 ФА): *біць трывогу, біць у набат* «настойліва звяртаць усеагульную ўвагу на што-н. небяспечнае, заклікаць да барацьбы з ім»; *біць у званы* «настойліва звяртаць усеагульную ўвагу на тое, што выклікае трывогу, заклікаць да барацьбы з якой-н. небяспекай». У іх выяўляецца празрыстая матывацыя і выражаецца адна з мэтавых установак маўлення.

ФА з агульнай семай «хвала» (2 ФА): *пець (спяваць) дыфірамбы, спяваць (пець) песні* «празмерна ўсхваляць, вельмі ўзносіць каго-, што-н.». ФА, паводле значэння, выражаюць адмоўную ацэнку, дзякуючы дадатковым семам «празмерна» і «вельмі», пры, здавалася б, станоўчым дзеянні протасітуацыі, абранай для стварэння вобраза ФА.

ФА з агульнымі семамі «нязгода», «пярэчанне» (2 ФА): *разяўляць рот, раскрываць рот* «не згаджацца, рэзка пярэчыць». Прыведзеныя ФА служаць для выражэння, як правіла, неадабрэння


© З. У. Шведава, 2013.

маўлення з адзначанай мэтай, хутчэй даюць адмоўную ацэнку праз абраны вобраз адкрытага рота і асабліва праз выкарыстанне дзеяслоўнага кампанента *разяўляць*.

Умоўна складаюць яшчэ адну групу паводле наяўнасці агульнай семы «насмiшка» ФА *скаліць зубы, выскаляць зубы* «смяяцца, рагатаць; насміхацца з каго-н.», што сваім вобразам адначасова служаць выражэнню злосці (узгадаем звярыны аскал) і пагарды для абазначэння насмешлівых адносін аднаго чалавека да другога. Да іх далучаецца яшчэ ФА *браць на язык* «рабіць каго-н. аб’ектам размоў, насмешкі; асуджаць чые-н. недахопы», што ўжо адзначана ў групе з семай «асуджэнне». А ў выніку названыя ФА дыферэнцыруюць яшчэ адну мэту маўлення чалавека – гаварыць, каб насмяяцца ці насміхацца над кім-небудзь.

Астатнія адзінкі фразеасемантычнага поля «маўленчая дзейнасць», якія маюць у сваім значэнні семы для абазначэння мэтавай накіраванасці маўлення, прадстаўлены адзінкавымі прыкладамі і не складаюць асобных груп, але не менш выразна сведчаць пра наяўнасць яшчэ некалькіх разнавіднасцей мэтавай установкі маўленчай дзейнасці: гаварыць з мэтай пагрозы (*даваць перуноў* «гнеўна, з абурэннем гаварыць, пагражаць»), скаргі і выкліку спачування (*пець (спяваць) лазара* «прыкідвацца няшчасным, каб расчуліць каго-н.; скардзіцца на свой лёс»), уздзеяння і павучання (*капаць на мазгі* «пастаянна гаварыць адно і тое ж, уздзейнічаючы на каго-н, павучаючы каго-н.»), прымусу каго-небудзь для раскрыцця сакрэту, тайны (*развязваць язык* «прымушаць каго-н. разгаварыцца і паведаміць які-н. сакрэт, тайну»).

ІІ. Выдзелена больш за 40 ФА, што складаюць фразеасемантычнае мікраполе «ацэнка якасці маўлення», выдзяляецца станоўчы, адмоўны ці нейтральны ацэначны кампанент фразеалагічнага значэння, дзякуючы якому выразна выяўляецца адабрэнне, асуджэнне ці адсутнасць ярка выражанага адабрэння або асуджэння як канстатацыі сацыяльна прынятай ацэнкі маўленчай дзейнасці чалавека. Аналіз ФА, якія рэпрэзентуюць аспект «*гаварыць як*», дазваляе выдзеліць 6 асноўных крытэрыяў яго ацэнкі, якія з’яўляюцца важнейшымі для беларуса: 1) сіла голасу, 2) эмацыянальнасць выражэння, 3) тэмпаральны паказчык, 4) паказчык розуму, 5) колькасць маўлення, 6) нарматыўнасць маўлення. Разгледзім дадзеныя крытэрыі.

Сіла голасу перадаецца палярнымі ацэначнымі кампанентамі фразеалагічнага значэння *ціха – гучна*. Прычым ФА як з ацэначным кампанентам *ціха*, так і з ацэначным кампанентам *гучна* нясуць адмоўную канатацыю. Так, значэнне «гаварыць ціха» замацавана за

© З. У. Шведава, 2013.

саматычнай ФА з празрыстай матывацыяй *пад нос*, пры гэтым значэнне ФА яшчэ ўдакладняецца кваліфікатыўнымі семамі паводле інтэнсіўнасці праяўлення (*вельмі*) ці ўспрымання (*незразумела*), што яшчэ больш узмацняе адмоўную ацэнку такога маўлення.

А значэнне «гаварыць гучна», па-першае, удакладняецца ў кожнай ФА выбарам сінанімічнага дзеяслова для абазначэння маўленчай дзейнасці ў дэфініцыі фразеалагізма – *гаварыць, расказваць* ці *крычаць*: *як у бубен біць* «голасна расказваць, настойліва перадаваць ад аднаго да другога (якія-н. весткі, чуткі і пад.)», *бухаць грамабойным голасам* «гаварыць празмерна гучна, крычучы, надрываючыся», *на чым свет* «моцна, многа (крычаць), гучна». Па-другое, ва ўсіх ФА падкрэсліваецца найперш высокая ступень сілы голасу, хаця і яна адметная ў кожнай. У прыватнасці, найвышэйшы ўзровень характарызуе ФА *бухаць грамабойным голасам*, значна менш і толькі гэты паказчык ілюструе ФА *на чым свет* і найменш сіла гучнасці характэрна ФА *як у бубен біць*. Такая дыферэнцыяцыя, відавочна, звязана з тым, што значэнне першай ФА сканцэнтравана толькі на сіле праяўлення маўленчага працэсу, значэнне другой, акрамя семы «*моцна, гучна*», утрымлівае яшчэ сему «*многа*», а трэцяй – сему «*настойліва перадаваць*». Такое адметнае значэнне вынікае з вобразаў кожнай ФА. Так, семы «*настойліва*» і «*голасна*» ў ФА *як у бубен біць* матывуюцца вобразнасцю самога фразеалагізма, уяўленнем манатоннасці і частаты ўдараў бубна, «*перадаваць*» – забыты спосаб «паштовага» назначэння бубнаў. Значэнне ФА *бухаць грамабойным голасам* матывуецца ўяўленнем голасу чалавека, падобнага на выбухі грому. Аб’ядноўвае ўсе тры адзінкі тое, што яны сваёй унутранай формай, вобразам нясуць адмоўную канатацыю, даюць негатыўную ацэнку такому праяўленню маўленчай дзейнасці ці яго характарыстыцы.

Да папярэдніх далучаецца кампаратыўная ФА *як шэршні* «гучна, злосна, заўзята (спрачацца)», дзе набор сем паўтарае адну з папярэдніх – «*гучна*» і далучае яшчэ адну характарыстыку – «*злосна*» ў адносінах да адной з разнавіднасцей маўлення – спрачацца. Вобраз шэршня, з якім параўноўваюцца ўдзельнікі спрэчкі, вядзе да з’яўлення дадатковай і найбольш выразнай семы «*злосна*», і такім чынам вынікае адмоўная ацэнка ФА.

Высокую ступень гучнасці маўлення нясе ФА *задаць пытлю* «моцна правучыць, выгаварыць, энергічна ўздзейнічаць на каго-н.», вобраз якой складаецца з сэнсаўтваральнага кампанента *задаць*, «які ў свабодным ужыванні, без дапаўнення, здольны рэалізаваць такое ж значэнне, як і ўвесь фразеалагізм (параўн., напрыклад: «Дам я табе!»)» і

 © З. У. Шведава, 2013.

ўстарэлага назоўніка *пыталь*, які мае значэнні «машына для пытлявання пшаніцы», «млын для пытлявання», «спецыяльны млынавы мяшок для прасейвання мукі, які механічна прыводзіцца ў рух» [2, с. 116]. Дадзеная ФА, зыходзячы са свайго вобраза, па сутнасці, ілюструе аб'яднанне двух крытэрыяў ацэнкі маўленчай дзейнасці – гучнасці і колькасці.

Эмацыянальнасць выражэння таго, хто гаворыць, выяўляецца ў разнастайнасці эмоцый і пачуццяў у маўленні чалавека. Эмацыйны кваліфікатар «гаварыць шчыра, праўдзіва» замацаваны за ФА *расчыніць душу, адкрыць душу,* у якіх кампанент *душа* сімвалізуе самае галоўнае, сутнасць чалавека, і калі яна расчынена ці адкрыта, то гэта і выяўляе крытэрый шчырасці, адкрытасці, праўдзівасці. Гэта падмацоўвае і ФА *праўду кажучы*, якая выкарыстоўваецца ў маўленні ў значэнні пабочнага слова. Значэнне «выказаць што-н. з болем, ад душы» замацавана за ФА *выліць слязамі*, вобразны складнік якой *слёзы* сімвалізуе боль, які перадаецца ў маўленні чалавека. Эмоцыя рашучасці перададзена ў ФА *як сякерай* (гаварыць) «катэгарычна, рашуча, упэўнена», што параўноўвае маўленне з ударам сякеры. А вось вобраз, пакладзены ў аснову ФА *як шылам* «балюча, непрыемна востра (казаць што-н. каму-н.)», выклікае адмоўнае пачуццё непрыемнасці праз параўнанне з шылам, якім наносяць уколы і такім чынам прычыняюць боль. Эмоцыя злосці як кваліфікатара маўлення адной асобы ў адносінах да другой фіксуецца ў значэнні «зласліва гаварыць каму-н. пра што-н. непрыемнае», замацаваным за ФА *на вока выкідаць*. Эмацыйны кваліфікатар «гаварыць дерзка» замацаваны за ФА *з рызыкай* «дзёрзка, з выклікам (гаварыць што-н.)». Эмоцыя знявагі перададзена ФА *з балотам мяшаць, з гразёй змяшаць* «усяляк зневажаць, груба абражаць, прыніжаць каго- ці што-н., несправядліва абвінаваціць» і *ў вочы кідаць* «папракаць, дакараць чым-н., рэзка выказваючы, не ўтойваючы».

Пэўная ступень удзелу эмоцый у маўленчай дзейнасці можа быць абазначана ў фразеалагічным значэнні семай «*вельмі*». Так, ФА з саматычным кампанентам *рукі* (*цалаваць рукі і ногі* «вельмі прасіць, маліць каго-н. аб чым-н., быць залежным», *лізаць рукі* «вельмі прасіць, маліць; угоднічаць, падхалімнічаць перад кім-н.») паказваюць высокую ступень эмацыйнага паказчыка гаварэння – просьбы: у першым выпадку да наяўнасці залежнасці, у другім – да падхалімства, што сімвалізуюць вобразы ФА. З адмоўнай ацэнкай успрымаецца і ФА *кланяцца ў ногі* «ўніжана прасіць аб чым-н. каго-н.», што выяўляе ўнутраная форма ФА.

Разнавіднасцю эмацыянальнага паказчыка маўлення выступаюць жэставыя ФА *на мігі* (размаўляць) «пры дапамозе жэстаў, знакаў» і *тыкаць пальцамі* «адкрыта, публічна асуджаць, ганіць каго-, што-н.»,

© З. У. Шведава, 2013.

дзе ў першай адсутнічае ацэнка, а ў другой, наадварот, замацавана негатыўная канатацыя, што імпліцытна ў жэсце пальца(-амі) «можна наслаць на чалавека нячыстую сілу» [1, с. 511].

Тэмпаральны крытэрый вызначае своечасовасць / нясвоечасовасць маўленчай дзейнасці. Станоўчую канатацыю, якая паказвае на своечасовасць маўлення, нясе ФА *да ладу* «дарэчы, у патрэбны момант (сказаць)», што ўзмацняецца як значэннем кампанента *лад* «згода, парадак, зладжанасць» [5, с. 311], так і дадатковай семай «*дарэчы*». Нясвоечасовасць маўлення выражана ФА як з нейтральнай ацэнкай (*зляцець слоўцу з языка* «нечакана выказаць што-н.; сарвацца», *вылецела слаўцо* «міжвольна выказаць, сказаць што-н.»), так і з адмоўнай (*уткнуць свае тры грошы* «нечакана і без патрэбы ўмяшацца ў чужую размову, гутарку, справу, калі не просяць»). Адмоўная ацэнка тлумачыцца негатыўным параўнаннем маўлення чалавека з вобразам-кампанентам *грош*, які з'яўляўся ў мінулым «даўнейшай меднай двухкапеечнай манетай, пазней паўкапеечнай» [5, с. 157], пакладзеным у аснову ФА, і дадатковымі адмоўнымі семамі «*без патрэбы*» і «*калі не просяць*».

Паказчык розуму выступае яшчэ адным крытэрыем ацэнкі маўлення. Ён можа быць як станоўчым, так і адмоўным, што і зафіксавана ў ФА. Да станоўчых паказчыкаў працэсу маўленчай дзейнасці адносяцца памяць (*з памяці* «не гледзячы куды-н., помнячы што-н. (гаварыць)»), дакладнасць (*слова ў слова* «даслоўна, абсалютна дакладна, без змен (пераказаць)»), дакладнасць і правільнасць (*як тапаром* (сячэ) «дакладна, правільна па зместу (гаварыць)»), дарэчнасць і дакладнасць (*слаўцо залатое* «сказанае дарэчы і вельмі трапна; выраз, які дакладна перадае асноўную сутнасць з'явы і г.д.»), абдуманасць (*слоў напуста не кідаць* «гаварыць абдумана, дарма не гаварыць»), красамоўнасць (*расцякацца мысляй па дрэву* «гаварыць, спяваць цудоўна, чароўна ў славу каго-н.; хваліць каго-н.»). Да адмоўных паказчыкаў адносяцца нуднасць і бесталковасць (*жаваць жавачку* «гаварыць нудна і бесталкова пра адно і тое ж»), надакучлівасць (*марочыць мазгі* «надакучліва гаварыць што-н. няправільнае, падманваючы каго-н.») маўленчага працэсу. Да апошніх ФА набліжаецца ФА *ламаць сабе языкі* «з цяжкасцю гаварыць на чужой мове», якая выяўляе дрэннае валоданне чужой мовай.

Колькасны крытэрый ацэнкі маўлення замацаваны за ФА з агульным значэннем «гаварыць многа», калі ў адной ФА колькасць гаварэння не асуджаецца (*колькі ўлезе* «уволю, удосталь, без усякага абмежавання (гаварыць)»), а ў другой (*як латак у млыне* «няспынна, многа і не да месца (гаварыць)»), наадварот, даецца адмоўная ацэнка,


© З. У. Шведава, 2013.

што выяўляецца з дапамогай параўнання з латаком як прыстасаваннем у млыне, які працуе няспынна.

Паказчык нормы маўлення зафіксаваны за кампаратыўнымі ФА *як той кажа*, *як кажуць* «як прынята гаварыць».

Такім чынам, семантычны аналіз амаль 120 ФА, што складаюць фразеасемантычныя мікрапалі «мэтавая накіраванасць маўлення» і «ацэнка якасці маўлення», сведчыць, па-першае, пра рэлевантнасць маўленчай дзенасці як важнага фрагмента фразеалагічнай карціны свету беларусаў. Па-другое, выяўленая семантычная групоўка ФА двух мікрапалёў сведчыць пра асаблівую ўвагу да маўлення чалавека з боку ўстаноўкі яго мэты і крытэрыя ацэнкі якасці. Выяўлена толькі 11 груп ФА ў залежнасці ад мэты маўлення – асуджэнне, папрок, абгавор, ашуканства, выдумка, абраза, просьба, заклік, хвала, нязгода, насмешка і 6 груп паводле адзначаных крытэрыяў ацэнкі якасці – сіла голасу, эмацыянальнасць, тэмпаральны паказчык, паказчык розуму, колькасць і нарматыўнасць маўлення, з якіх найбольш разнастайнымі паводле выражэння эмоцый і ступені гучнасці з'яўляюцца адпаведна эмацыянальнасць і сіла голасу. Устаноўлена культурна-нацыянальная інфармацыя, сродкам выяўлення якой служаць абраныя вобразы ФА, іх інтэрпрэтацыя ў культурнай прасторы нашага народа і тая ацэнка, якую ФА перадаюць у часе і прасторы. Усе прааналізаваныя ФА сваімі вобразамі, унутранай формай даводзяць пра перавагу адмоўнага ў ацэнцы маўлення і выступаюць як своеасаблівыя правілы ці антыправілы арганізацыі маўленчай дзейнасці.

**Літаратура**

1. Бирих А. К. Русская фразеология. Историко-этимологический словар : ок. 6000 фразеологизмов / СПбГУ ; Межкаф. словарный каб. им. Б.А. Ларина ; А. К. Бирих, В. М. Мокиенко, Л.И. Степанов; под ред. В. М. Мокиенко. – [3-е изд., испр. и доп.]. – М. : Астрель : АСТ : Хранитель, 2007. – 926 с.

2. Лепешаў І. Я. Этымалагічны слоўнік фразеалагізмаў / І. Я. Лепешаў. – Мінськ : БелЭн, 2004. – 448 с.

3. Лепешаў І. Я. Слоўнік фразеалагізмаў : у 2 т. / І. Я. Лепешаў. – Т. 1 (А – Л). – Мінск : Беларус. энцыклапедыя імя П. Болўкі, 2008. – 672 с.; Т. 2 (М – Я). – 704 с.

4. Телия В. Н. Русская фразеология. Семантический, прагматический и лингвокультурологический аспекты / В. Н. Телия. – М. : Языки русской культуры, 1996. – 288 с.

5. Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы : Больш за 65000 слоў / Пад рэд. М. Р. Судніка, М. Н. Крыўко. – Мінськ : БелЭн, 2002. – 784 с.

Стаття надійшла до редакції 11.11.2013 р.

© З. У. Шведава, 2013.